# ПАДАГУЛЬНЕННЕ І СІСТЭМАТЫЗАЦЫЯ ВЫВУЧАНАГА ПА ТЭМЕ “ПРЫМЕТНІК”. 6 КЛАС

**Брытанава Сняжана Мікалаеўна,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры ДУА “Суражская сярэдняя школа імя Героя Савецкага Саюза М.П. Шмырова”

***Незвычайнае хараство і зладжанасць чуецца нам у гучанні роднага слова!***

*Урок праводзіцца ў 6 класе пасля вывучэння ўсёй тэмы “Прыметнік” (падагульняючы ўрок). На занятку вучні замацоўваюць і сістэматызуюць набытыя веды. Заданні, што выконваюцца на ўроку, садзейнічаюць фарміраванню ўмення вызначаць лексіка-граматычныя разрады прыметнікаў, правільна даваць марфалагічную і словаўтваральную характарыстыку прыметнікам; спрыяюць удасканаленню камунікатыўных уменняў вучняў. Шасцікласнікі актуалізуюць тэарэтычныя звесткі, а потым прымяняюць набытыя веды на практыцы.*

**Тэма ўрока.** Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага па тэме “Прыметнік”.

**Задачы:**

1) садзейнічаць развіццю ўмення вызначаць лексіка-граматычныя разрады прыметнікаў, правільна даваць марфалагічную і словаўтваральную характарыстыку прыметнікам;

2) удасканальваць камунікатыўныя ўменні, неабходныя для работы ў групе; развіваць памяць і мысленне, творчыя здольнасці;

3) спрыяць выхаванню патрыятычных пачуццяў, пачуцця замілаванасці ў адносінах да прыроды, цікавасці да вывучэння беларускай мовы, пачуцця калектывізму і адказнасці за сумесную працу.

**Абсталяванне:** асабістыя карты заданняў у вучняў, мультыборд.

**Тып урока:** абагульняючы ўрок.

**Элементы выкарыстаных тэхналогій:** гульнёвая, узроўневая дыферэнцыяцыя, ІКТ, візуалізацыя.

**Клас:** 6

**Этапы урока:**

**I. Арганізацыйна-матывацыйны этап**

*Псіха-эмацыянальны настрой класа*

Весела гучыць званок,
Яго голас нам знаёмы,
Запрашае на ўрок
Беларускай мовы!

— Добры дзень, паважаныя вучні! Я рада вас усіх бачыць на ўроку. Пачынаем нашу працу з добрага настрою, а для гэтага ўсміхніцеся адзін аднаму, настаўніцы.

— У вас на стале ў кожнага ёсць ліст кантролю, куды вы будзеце на працягу ўрока ўносіць адзнакі за работу. Паглядзіце ўважліва ў ліст кантролю, знайдзіце радок: “Адзнака, якую плануеце атрымаць за ўрок”. Пастаўце плануемую адзнаку. У канцы ўрока вы выставіце выніковую адзнаку і параўнаеце, ці супалі вашы адзнакі.

**II. Праверка дамашняга задання**

— А зараз праверым дамашняе заданне. Вам неабходна было напісаць міні-сачыненне (4–5 сказаў) на тэму “Мае любімыя прысмакі”, выкарыстоўваючы прыметнікі. Прыметнікі падкрэсліць, назваць.

**III. Вызначэнне тэмы і задач урока**

На дошцы запісана дата і тэма ўрока, але (знарок) не ўказана назва тэмы, па якой будзе праходзіць абагульненне.

*Праца з эпіграфам.*

— Звярніце ўвагу на словы, запісаныя на экране. Давайце іх прачытаем услых.

Я аздабляю нашу мову:
*Даю прыметы розным словам.*
Наўрад ці зможаш без мяне ты
Прадмет адрозніць ад прадмета.
(Прыметнік)

— Якая часціна мовы можа так пра сябе сказаць?

— Значыць, сёння мы павінны падагуліць і сістэматызаваць набытыя веды па тэме “Прыметнік”. (Настаўнік дапісвае слова “Прыметнік” у тэме ўрока, якая запісана на дошцы)

— Давайце прыгадаем, што мы рабілі на папярэдніх уроках, і скажам, што мы будзем рабіць сёння на ўроку? (Паўтараць, што такое прыметнік; шукаць у сказах прыметнікі, вызначаць іх род, лік, склон, разрады паводле значэння; правільна ўтвараць і пісаць прыметнікі).

*Будзем ведаць…*

*Будзем умець…*

*Запіс даты і тэмы ўрока ў сшытак.*

— Давайце ўспомнім, як называецца раздзел навукі аб мове, у якім словы вывучаюцца як часціны мовы? (Марфалогія)

— А ведаеце, што ёсць незвычайная краіна Марфалогія, у якой жывуць розныя часціны мовы, і што кіруе гэтай краінай маладая спадарыня Марфалогія. У Марфалогіі шмат сяброў, розных часцін мовы. Ёсць сябар Прыметнік. Ці жадаеце вы пабачыць яго? Калі вы будзеце хуценька і правільна выконваць усе заданні, то ў канцы ўрока вы пабачыце спадара Прыметніка, які жыве ў краіне Марфалогіі. Згодны? (Да) Тады хуценька пачынаем.

**IV. Падагульненне і сістэматызацыя матэрыялу па тэме “Прыметнік”**

**I заданне. Лічбавы дыктант**

— Зараз мы ўзгадаем тэарэтычныя звесткі па тэме “Прыметнік”. (Вучні паўтаралі дома тэарэтычны матэрыял па тэме “Прыметнік”)

*Лічбавы дыктант:* калі згодны — 1, не — 0.

1. Прыметнік — самастойная часціна мовы, якая абазначае прымету прадмета і адказвае на пытанні *які? чый?* (1)

2. Род, лік, склон прыметнікаў залежаць ад роду, ліку і склону назоўнікаў. (1)

3. Пачатковая форма прыметніка — форма жаночага роду, адзіночнага ліку, назоўнага склону. (0)

4. Паводле значэння, прыметнікі падзяляюцца на якасныя, адносныя і прыналежныя. (1)

5. Якасныя прыметнікі абазначаюць прыметы прадметаў паводле іх прыналежнасці пэўнай асобе ці жывёле. (0)

6. Кароткая форма прыметніка ў назоўным склоне адзіночнага ліку мужчынскага роду мае нулявы канчатак. (1)

7. Адносныя прыметнікі могуць мець вышэйшую і найвышэйшую ступені параўнання. (0)

8. Ад назоўнікаў мужчынскага роду прыналежныя прыметнікі ўтвараюцца з дапамогай суфіксаў -ін-(-ын-). (0)

9. Мяккі знак перад суфіксам -ск- пішацца ў прыметніках, утвораных ад назваў месяцаў на -нь і ад назоўніка восень. (1)

10. Не(ня) з прыметнікамі пішацца разам, калі прыметнік без не(ня) не ўжываецца. (1)

*Абмен сшыткамі (узаемаправерка).* Вучні ў ролі настаўнікаў.

Калі адказы супадаюць — +, не — –.

— Падлічыце колькасць плюсаў, выстаўце алоўкам бал за работу ў сшытак, потым кожны сам сабе паставіць адзнаку ў ліст кантролю.

— Перанясіце адзнакі ў ліст кантролю.

*Адказы:*

1–1
2–1
3–0
4–1
5–0
6–1
7–0
8–0
9–1
10–1

**II заданне (франтальная работа)**

*Работа з тэкстам*

Прачытайце тэкст. Устаўце прапушчаныя літары.

Веснав… цёпл… ноч толькі што апранула зямлю і ра..кідала свае таемн… чары, поўн… крыху смутн… характва. Першыя зоры замігцелі то там, то сям у бя..донн… небе, а з-за лесу ў..німаўся кругам блішчаст… месяц. Дробн… бел… хмаркі высцілалі яму даро..ку сваімі лё..к… празрыст… тканямі і ра..ступаліся перад ім. (Паводле Я. Коласа)

Веснавая цёплая ноч толькі што апранула зямлю і раскідала свае таемныя чары, поўныя крыху смутнага характва. Першыя зоры замігцелі то там, то сям у бяздонным небе, а з-за лесу ўзнімаўся кругам блішчасты месяц. Дробныя белыя хмаркі высцілалі яму дарожку сваімі лёгкімі празрыстымі тканямі і расступаліся перад ім. (Паводле Я. Коласа)

— Пра што гэты тэкст? (Пра прыроду, пра наступленне ночы, з’яўленне першых зорак)

— Назавіце стыль тэксту? Чаму тэкст адносіцца да мастацкага стылю? (Тэкст адносіцца да мастацкага стылю. Па-першае, аўтар тэксту — пісьменнік Якуб Колас. Па-другое, для тэксту характэрна вобразнасць, ёсць мастацкія сродкі: эпітэты, метафары)

— Вызначым род, лік, склон выдзеленага прыметніка. Чаму ў дадзеным прыметніку -нн-? Ад якога назоўніка ён утвораны?

— Давайце паспрабуем апусціць прыметнікі. Які тэкст больш вобразны, прыгожы: з прыметнікамі ці без? Якая роля прыметнікаў у тэксце? (Прыметнікі дапамагаюць больш вобразна і прыгожа апісаць прадмет)

Ноч толькі што апранула зямлю і раскідала свае чары. Першыя зоры замігцелі то там, то сям у небе, а з-за лесу ўзнімаўся кругам месяц. Хмаркі высцілалі яму дарожку сваімі тканямі і расступаліся перад ім. (Паводле Я. Коласа)

**III заданне (работа ў парах)**

— Вам неабходна ўтварыць усе ступені параўнання ад прапанаваных прыметнікаў у словазлучэннях. Працаваць вы будзеце ў парах. З першым словазлучэннем працуе адзін чалавек, з другім — другі. Табліцу запаўняеце на картцы.

| Словазлучэнне | Простая форма вышэйшай ступені параўнання | Складаная форма вышэйшай ступені параўнання | Простая форма найвышэйшай ступені параўнання | Складаная форма найвышэйшай ступені параўнання |
|---|---|---|---|---|
| Цёплы вечар | | | | |
| Малое дзіця | | | | |

| Словазлучэнне | Простая форма вышэйшай ступені параўнання | Складаная форма вышэйшай ступені параўнання | Простая форма найвышэйшай ступені параўнання | Складаная форма найвышэйшай ступені параўнання |
|---|---|---|---|---|
| Цёплы вечар | цяплейшы | больш цёплы | найцяплейшы | найбольш цёплы |
| Малое дзіця | меншае | больш малое | найменшае | самае малое |

**IV заданне (самастойная работа)**

Размяркуйце прыметнікі па групах у залежнасці ад значэння. Працуеце кожны самастойна ў сваім сшытку. Намалюйце табліцу ў сшытак і пачынайце запаўняць яе.

Цёплая вясна, зімняя сцюжа, матчына паліто, лясная рэчка, глыбокая крыніца, залатая восень, сярэбраны пярсцёнак, высокая гара,бацькаў партфель, летні адпачынак.

| якасныя | адносныя | прыналежныя |
|---|---|---|
| | | |
| | | |
| | | |
| | | |
| | | |

| якасныя | адносныя | прыналежныя |
|---|---|---|
| цёплая | зімняя | матчына |
| глыбокая | лясная | бацькаў |
| залатая | летні | |
| высокая | сярэбраны | |

— Праверым правільнасць выканання задання. 1 бал за 1 правільна размеркаванае словазлучэнне. Пастаўце сабе адзнаку ў сшытак і ў ліст кантролю.

**V заданне (праца ля дошкі)**

*Моцныя вучні працуюць на картках*

Картка для моцных вучняў

***Утварыце словазлучэнні, дапасаваўшы прыметнікі да назоўнікаў.***

Бел... гусь, калмат… сабака, залат… медаль, доўг... цень, салдацк… шынель, любім… мазоль, каротк… запіс, лясн... апенька, вялік... боль, маленьк... ваўчаня.

Белая гусь, калматы сабака, залаты медаль, доўгі цень, салдацкі шынель, любімы мазоль, кароткі запіс, лясная апенька, вялікі боль, маленькае ваўчаня.

***Утварыць прыметнікі:***

туман + н
лімон+н
восень + ск
сінія вочы
пяць гадоў
полымя+н
горад+ск
белы і сіні
брат+ск
француз+ск

Туманны, лімонны, восеньскі, сінявокі, пяцігадовы, палымяны, гарадскі, бела-сіні, брацкі, французскі.

**Фізкультхвілінка (тэматычная)**

РАЗАМ, АСОБНА, ПРАЗ ЗЛУЧОК

(Не)лёгкая, а

(Не)багаты
(Не)далёкі, а
(Не)дрэнны
(Не)лянівы
Зусім (не)яркі
(Не)абходны
(Не)спынны
(Не)вялікі
(Не)правільны
(Не)шырокі, а
(Не)знаёмы
Паўднёва(заходні)
Бела(зялёны)

**VI заданне. Гульня “Што агульнае”**

*Слабыя вучні працуюць на картках*

— Што агульнае паміж:
нажом і болем; (вострыя)
каменем і словам; (цвёрдыя)
валасамі і сустрэчамі; (рэдкія)
колерам і радком. (чырвоныя)

— У якім ліку ўжыты прыметнікі? (У множным)

***Картка для слабых вучняў***

Знайсці і падкрэсліць хвалістай лініяй прыметнікі. Раскрыць дужкі, уставіць літары.

Асе(н,нн)яй раніцай у лес… стаіць туман. Кас… промні сонца надаюць лесу казачны выгляд. Але вось туман знікае і паветра становіцца празрыст… .

**VII заданне (работа ў групах)**

— Да ўрока я вам падабрала прыказкі, але па дарозе да вас яны рассыпаліся. Вам неабходна са слоў скласці прыказку, растлумачыць яе сэнс, знайсці ў ёй прыметнікі і вызначыць іх склон.

1 група:
Пад ляжачы камень і вада не цячэ.

2 група:
У чужой старонцы не так свеціць сонца.

**V. Кантрольна-рэфлексійны этап**

Тэставая работа па тэме “Прыметнік”

Варыянт 1

1. Што абазначае прыметнік?
А) прымету дзеяння;
Б) дзеянне прадмета;
В) прымету прадмета.

2. Адзначце прыметнік у форме вышэйшай ступені параўнання:
А) прыгажэйшы;
Б) найбялейшы;
В) глыбокі.

3. Адзначце словазлучэнні з якаснымі прыметнікамі:
А) гарадская вуліца, школьны двор;
Б) глыбокая рака, кіслы яблык;
В) лісіная нара, сястрын дом.

4. Адзначце няправільна ўтвораны прыналежны прыметнік:
А) Васевы канькі;
Б) у дзядуліным садзе;
В) ластаўчына гняздо.

5. Адзначце прыметнікі, у якіх ва ўсіх словах радка пішацца -н-:
А) драўля…ы, ветра…ы;
Б) будзё…ы, абедзе…ы;
В) імя…ы, вогне…ы.

6. Адзначце прыметнік, які пішацца праз злучок:
А) (жоўта)белы;
Б) (шэра)вокі;
В) (сто)гадовы.

7. Адзначце правільна напісаныя прыметнікі:
А) французскі, нясвіжскі;
Б) палесскі, таварышскі;
В)коньскі, любанскі.

8. Адзначце прыметнікі, з якімі не(ня) пішацца разам:
А)(не)гарачы,а халодны;
Б) зусім (не)глыбокі, (не)высокі;
В) (не)абходны, (не)ахайны.

9. Адзначце варыянт, у якім няправільна ўтвораны ступені параўнання прыметнікаў:
А) самы добры, больш высокі;
Б) найменш смелы, самы разумны;
В) больш цікавейшы, найблізкі.

10. Перакладзіце словазлучэнне южно-западный ветер на беларускую мову.

*Правільныя адказы:*

1В, 2А, 3Б, 4Б, 5А, 6А, 7А, 8В, 9В, 10 — паўднёва-заходні вецер.

Варыянт 2

1. Якім членам сказа звычайна бывае прыметнік?
А) акалічнасцю;
Б) дапаўненнем;
В) азначэннем.

2. Адзначце, які прыметнік не ўтварае ступені параўнання?
А) цёплы;
Б) карычневы;
В) высокі.

3. Адзначце правільнае сцвярджэнне:
А) Ступені параўнання ўтвараюць толькі якасныя прыметнікі.
Б) Усе якасныя прыметнікі ўтвараюць ступені параўнання.
В) Ступені параўнання ўтвараюць якасныя, адносныя і прыналежныя прыметнікі.

4. Адзначце прыметнік, ужыты ў значэнні якаснага:
А) арліны палёт;
Б) вавёрчын хвост;
В) лісіны характар.

5. Адзначце няправільна ўтвораны прыналежны прыметнік:
А) дзядзькіны браты;
Б) бабуліны акуляры;
В) вавёрчын хвост.

6. Адзначце прыметнікі, у якіх ва ўсіх словах радка пішацца - нн- :

А) сярэбра…ы, алавя…ы;

Б) скура…ы, дзё…ы;

В) карэ…ы, семя…ы.

7. Адзначце прыметнік, які пішацца разам:

А) (вечна)зялёны;

Б) (сіне)зялёны;

В) (паўднёва)усходні.

8. Адзначце правільна напісаныя прыметнікі:

А) адэскі, гарацкі;

Б) каўказскі, русскі;

В) калінкавіцкі, суседскі;

9. Адзначце варыянт, у якім няправільна ўтвораны ступені параўнання прыметнікаў:

А) самы меншы, больш ярчэйшы;

Б) найбольш добры, самы вялікі;

В) менш цікавы, самы доўгі.

10. Перакладзіце словазлучэнне северо-восточный ветер на беларускую мову.

*Правільныя адказы:*

1В, 2Б, 3А, 4В, 5А, 6В, 7А, 8В, 9А, 10 — паўночна-ўсходні вецер.

*Узаемаправерка.*

— Памяняйцеся сшыткамі і праверце тэставую работу аднакласніка, пастаўце бал алоўкам, потым кожны сам сабе перастравіць адзнаку ў ліст кантролю.

— Нарэшце выкананы ўсе заданні, і мы можам пабачыць Спадара Прыметніка, які жыве ў чароўнай краіне Марфалогіі.

**VI. Вынікі. Выстаўленне адзнак**

Настаўнік прапануе вучням пытанні:

— Якую тэму мы паўтарылі? Што такое прыметнік?

— Падлічыце сярэдні бал трох сваіх адзнак і пастаўце ў ліст кантролю выніковую адзнаку за работу на ўроку.

(Адзнакі выстаўляюцца з улікам лічбавага дыктанта на пачатку ўрока, а таксама ўлічваецца, як вучань працаваў на працягу ўсяго ўрока, як выканаў тэст, самастойную работу). Кожны вучань устае і каменціруе сваю адзнаку, настаўнік уносіць свае прапановы. Вучні пачынаюць выстаўленне адзнак наступнымі словамі:

*Я паставіў(ла) б сабе адзнаку…, бо…*

— Параўнайце і скажыце, ці супалі вашы адзнакі: тая, якую вы выставілі на пачатку ўрока, і тая, што атрымалі ў канцы ўрока.

**VII. Рэфлексія. Прадоўжыце фразы:**

— Ацаніце ваш настрой на ўроку ў балах (ад 1 да 10), чым вышэй ваш настрой, тым вышэй і бал, выберыце сэрца такога колеру, які вам падабаецца, пастаўце бал у сэрцы і прымацуйце сэрца да дошкі.

**VIII. Дамашняе заданне**

Пр. 342 (спісаць 2 абзац тэксту, устаўляючы прапушчаныя канчаткі прыметнікаў).

На 9–10 балаў: складці невялікі тэкст-апісанне вясновага лесу, выкарыстоўваючы прыметнікі, якія падкрэсліць. (Прыём “Творчыя заданні”)

Падзяка за працу на ўроку.

ДАДАТАК

Ліст кантролю

Прозвішча, імя вучня________________________

Адзнака, якую плануеце атрымаць за ўрок_______________

| № п/п | Заданне | Максімальны бал | Набраны бал |
|---|---|---|---|
| 1 | Лічбавы дыктант | 10 (1 правільны адказ — 1 бал) | |
| 2 | Праца з табліцай ( размеркаванне па групах) | 10 (1 правільна размеркаванае слова — 1 бал) | |
| 3 | Тэставая работа | 10 (1правільны адказ — 1 бал) | |
| | Усяго: | 10 | |

Адзнака, якую атрымалі за ўрок_______________